**2000 год**

**Асіноўскі, С. Ехаў дзедка на кірмаш…/ Святаслаў Асіноўскі // Праца. – 2000. – 15 студзеня. – С.4.**

Каб атрымаць найбольш яскравае ўяўленне аб беларускім кірмашы як з'яве, лепш за ўсё перанесціся ў Зэльву канца XVIII – першай паловы XIX стагоддзя. На гэты час прыходзіцца найбольшы росквіт тутэйшага кірмашу, што, як лічаць даследчыкі, з'яўляўся ўнікальным па тым часе гандлёвым мерапрыемствам.
Давайце разам з вамі пройдземся па гандлёвых радах Зэльвенскага кірмаша, кінем вокам на прывезеныя сюды тавары…

Кіпіць, віруе кірмаш… І ёсць тут усё, што толькі пажадае душа… Барадатыя маскавіты і ніжагародцы прапаноўваюць футры, жалеза, шкло. Вясёлыя віславусыя хахлы і смуглявыя балканскія купцы запрашаюць купіць віно, бакалею, хлеб, тытунь, чай. Паважныя прыбалты гандлююць селядцамі, соллю, тканінай. На кірмашы многа коней: у продажы іх заўзята сапернічаюць паміж сабой расіяне і ўкраінцы. Дарэчы, конскі гандаль у Зэльве – адмысловы. Як сведчаць дакументы, бывалі гады, калі на кірмашы іх прадавалі па некалькі тысяч…

Завяршаючы апавяд аб Зэльвенскім кірмашы, трэба заўважыць, што, як адзначае Адам Кіркор у "Живописной России", Ваўкавыскі павет, дзе знаходзілася Зэльва, "…яшчэ нядаўна славіўся на ўсю Літву сваімі кірмашамі".